*Карысная справа*

# ІДЭЙ ШМАТ НЕ БЫВАЕ,

## альбо Якія маладзёжныя ініцыятывы атрымалі гранты?

У Мінску назвалі 26 праектаў — пераможцаў рэспубліканскага Конкурсу маладзёжных ініцыятыў. Іх аўтары атрымалі ганаровыя пасведчанні на атрыманне фінансавання. А мы вырашылі распавесці чытачам пра некаторыя ідэі, якія будуць увасоблены ў найбліжэйшай перспектыве.



«Кірункі дзейнасці прадстаўленых праектаў вельмі разнастайныя; сумы, якія патрабуюцца на іх рэалізацыю, таксама ва ўсіх розныя: ад тэхнічнага і рэабілітацыйнага абсталявання да будаўнічых матэрыялаў і спартыўных прылад. Вельмі радасна, што фінансаванне штогод расце, бо ўсё, што датычыцца работы з моладдзю, — гэта вельмі важна. Наша падтрымка ініцыятыў маладых людзей забяспечыць іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і плённую працу заўтра», — адзначыла **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.**

Нагадаем, у трэцім сезоне заяўкі на ўдзел у конкурсе падалі 193 праекты. З іх кампетэнтная камісія адабрала 26 пераможцаў. Прадстаўнікі кожнай з 26 ініцыятыў расказалі пра сваю ідэю. Многія з іх накіраваны на развіццё творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу моладзі. Так, **студэнткі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова ствараюць медыйны цэнтр «Studlife»,** у якім студэнты могуць паспрабаваць сябе ў якасці карэспандэнтаў, рэдактараў, фотакарэспандэнтаў і гэтак далей. «Такі праект дапамагае прыцягнуць абітурыентаў, павысіць цытуемасць універсітэта, а таксама дазваляе студэнтам зрабіць першыя крокі ў журналісцкай дзейнасці. Наш праект ужо рэалізуецца, мы вядзём сацыяльныя сеткі і відэаканал. Напрыклад, папулярнасцю карыстаецца рубрыка «10 школьных пытанняў»: у відэа, дзе дарослым задаюць пытанні са школьнай праграмы, ужо прынялі ўдзел прарэктары па выхаваўчай і вучэбнай рабоце. І мы ўвесь час удасканальваем наш кантэнт», — паведамілі студэнткі.

Са студэнтамі звязаны і **праект Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра па стварэнні мабільнага кінатэатра пад адкрытым небам** у студэнцкай вёсцы ў Мінску. Кіраўнік цэнтра Юлія Зінкевіч патлумачыла: «Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр размешчаны ў студэнцкай вёсцы, дзе пражывае каля 10 тысяч чалавек. Студэнты выказалі жаданне: было б вельмі добра, калі б у нас з'явіўся кінатэатр. І мы вырашылі, што такі кінатэатр стане цудоўнай пляцоўкай для прагляду цікавых, у тым ліку гістарычных ці патрыятычных, фільмаў і іх абмеркавання». Юлія таксама адзначыла, што ўсё абсталяванне кінатэатра будзе мабільным, што дазволіць яго перавозіць і на выязныя мерапрыемствы, форумы, выставы, фестывалі. «Спадзяёмся, ужо гэтым летам зможам запрасіць студэнтаў, ды і ўсіх ахвотных на першы сеанс!» — дадала яна.

Заслугоўваюць увагі і праекты па інклюзіўным развіцці, добраўпарадкаванні населеных пунктаў і, вядома, па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Сярод такіх вылучыўся малады **настаўнік гісторыі з вёскі Астрамечава Анатоль Бурак, які прадставіў праект мясцовага музея на базе школы.** Высветлілася, што ў невялікай вёсцы знаходзілі такія значныя матэрыяльныя каштоўнасці, як язычніцкі ідал, манеты часоў Рымскай імперыі, помнік пісьменнасці XVII стагоддзя «Полацкі сшытак» (ён жа «Астрамечаўскі рукапіс»). «Музея пакуль яшчэ няма, але вучні ўжо прыносяць прадметы, якія ўвойдуць у экспазіцыю. У нас ужо ёсць артэфакты XVIII, XIX і XX стагоддзяў, у тым ліку часоў Першай і Другой сусветных войнаў... Яшчэ адна мэта праекта — развіць цікаўнасць і гістарычную свядомасць дзяцей праз практычную дзейнасць. Так, на базе музея будзе фарміравацца калектыў вучняў, будучых экскурсаводаў і лектараў. Магчыма, некаторыя з іх і надалей звяжуць жыццё з гісторыяй і музейнай справай», — падкрэсліў настаўнік. Анатоль Бурак распавёў таксама пра меркаваную планіроўку міні-музея. У ім будзе тры пакоі: першы прысвечаны гісторыі вёскі і мясцовасці да XX стагоддзя, другі — Вялікай Айчыннай вайне і выхадцам з Астрамечава, якія ў ёй удзельнічалі, а трэці — рабоце мясцовага краязнаўца Івана Панасюка і этнаграфічным асаблівасцям вёскі.

Яшчэ адзін настаўнік, на гэты раз — фізік — з Чэрвеня распавёў пра **стварэнне клуба віртуальнай рэчаіснасці «VReale».** Ён падкрэсліў, што віртуальная рэчаіснасць — гэта не проста забаўка, гэта сучаснае ноу-хау, якое ўжо дапамагае ў многіх галінах, такіх як дызайн, медыцына і праектаванне. «VReale» дапаможа нам у адукацыі пры вывучэнні некаторых прадметаў, а таксама ў прафарыентацыйнай рабоце з моладдзю. Ахвотныя змогуць адчуць сябе ў ролі ўрача, выратавальніка ці нават касманаўта — мы ўжо знайшлі




суадносныя сімулятары прафесій!» — заявіў настаўнік. Дарэчы, словы пра касманаўтыку і відэа з дадзеным сімулятарам зала сустрэла апладысментамі, бо ўсе ўзгадалі нядаўні касмічны палёт першай беларускай касманаўткі Марыны Васілеўскай.

Сярод праектаў, якія прыцягнулі шмат увагі, і **пошукавы атрад «Пульс»,** які ўжо цяпер рэгулярна выязджае на пошук заблудных і зніклых без вестак у Гомельскай вобласці. **Дзмітрый ЯКУБЧЫК, адзін з суаўтараў праекта,** распавёў, што «Пульс» займаецца ў асноўным пошукам людзей, але таксама атрад арганізуе, так бы мовіць, школы бяспекі, дзе паведамляюць пра паводзіны на прыродзе і ў горадзе, праводзяць квэсты і гульні з дзецьмі ў летніх лагерах, вучаць арыентавацца ў лесе, працаваць з компасам і гэтак далей. Прадстаўнікі атрада разгарнулі сапраўдную экспазіцыю апаратуры, якой карыстаюцца. «Тут у нас радыёстанцыі, якія патрэбныя для сувязі ў лясным асяроддзі, ліхтарыкі, а таксама святлошумавыя пускальнікі, патрэбныя для абароны нашых валанцёраў ад дзікіх жывёл ці абазначэння месцазнаходжання. Вядома, возім з сабой акумулятары і паўэр-банкі, бо для пошуку выкарыстоўваем на ноўтбуку спецыяльныя праграмы, якія малююць карту мясцовасці, наносяць на яе сетку. А гэта інвертар, з дапамогай якога можна падключыцца да электрычнасці з машыны», — распавядае Дзмітрый. Валанцёры пошукавага атрада выдзяляюцца стыльнай і практычнай уніформай з шаўронамі «Пульсу», у кожнага — асабістыя пазыўныя.

**Ганна РОВІНА, фота аўтара.**

*Свой стыль*

# МАСТАЦТВА З УРБАНІСТЫЧНЫМ ХАРАКТАРАМ

Стрыт-арт — кірунак у сучасным выяўленчым мастацтве, асаблівымі рысамі якога з'яўляюцца яркасць і неадназначнасць. Калі шукаць у пошукавіку значэнне дадзенага тэрміна, то мы ўбачым мноства вынікаў — ад «хуліганства» да «эвалюцыйных формаў графічнага мастацтва». Там жа можна прачытаць, што асноўнай часткай стрыт-арту з'яўляецца графіці, але нельга лічыць, што стрыт-арт — гэта і ёсць графіці. Да названага кірунку адносяцца постары, трафарэты, розныя скульптурныя інсталяцыі і г. д. Асаблівасцю таксама з'яўляецца ярка выражаны ўрбаністычны характар. Каб разабрацца ў тэме ад першай асобы, мы паразмаўлялі са стрыт-арт-мастаком Глебам КАШТАНАВЫМ.



— Ужо больш як дзесяць гадоў я займаюся вулічным мастацтвам. Пачынаў з графіці, як і ўсе тыя, хто ўзяў у рукі балончыкі з фарбай упершыню. Пры гэтым вучыўся ва ўніверсітэце, вывучаў малюнак, жывапіс, кампазіцыю і іншыя класічныя дысцыпліны. На парах практыкаваў акадэмічны малюнак, а пасля іх — вулічны кірунак. Было цікава гэта сумяшчаць, сінтэзаваць сваю творчасць у нешта новае — усё тое і прывяло мяне да стрыт-арту. Наогул, яшчэ ў дзяцінстве бацькі заўважылі маё імкненне да выяўленчага мастацтва і паспрыялі яго развіццю: аддалі ў школу з мастацкім ухілам, адвялі на заняткі па мастацтве, а ўжо пазней я паступіў у Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. Машэрава на дызайнера. Увесь мой творчы шлях яны падтрымлівалі, падтрымліваюць і цяпер мяне ва ўсіх пачынаннях і з разуменнем ставяцца да ўсіх стадый развіцця ў гэтай сферы. Быў час, калі я з маімі сябрамі ў гаражы бацькі адпрацоўваў новыя тэгі і прыёмы, перш чым пайсці на вуліцу. Гараж і сёння ўвесь у графіці як напамін пра мае пачыNанні. *(Смяецца.)*

Дык што ж такое стрыт-арт для Глеба?

— Для мяне — свабода, поле для эксперыментаў, вялізная экспазіцыйная прастора з мноствам гледачоў. Гэта дынамічны напрамак мастацтва, што пастаянна развіваецца, у якім амаль няма правілаў.

Эскізы работ стрыт-арт-мастака практычна не могуць быць тыповымі, кожная новая карціна — гэта новае месца ў гарадскім асяроддзі і адпаведна новая канфігурацыя, новая кампаноўка. Часам сама лакацыя падказвае рашэнне для эскіза. Тэматыка можа быць абсалютна рознай: ад гумару і коміксаў да складаных канцэпт-артаў на гістарычныя ці надзённыя тэмы.

У кожнага прафесіянальнага мастака ёсць свае адметныя рысы ў рабоце. Наш суразмоўнік пазіцыянуе сябе як эксперыментатар і свой стыль у стрыт-арце называе «стылем свабоды». Заўсёды новыя падыходы, эксперыменты са змешваннем жанраў і гульня з фактурамі. Глеб любіць нестандартныя сценкі з «разыначкай», яму падабаецца абыгрываць гэта. Галоўныя крытэрыі для нашага героя ў працы — ідэя і якасць выканання, а сама работа па маштабах можа быць як невялікім трафарэтам, так і велізарным муралам на фасадзе будынка.

— Калі казаць пра самую складаную работу, то гэта мурал «Прастора натхнення», які быў зроблены напрыканцы мінулага лета ў Віцебску на фасадзе дванаццаціпавярховага дома. Апроч няпростай задачы зрабіць твор фарматам 500 квадратных метраў, я сутыкнуўся з вялікай колькасцю арганізацыйных момантаў. Падключэнне абсталявання, электрычнасці, паломкі тэхнікі, складаныя ўмовы надвор'я — дзённае пекла вышэй за трыццаць градусаў і тыдзень дажджоў. Праект, разлічаны на пятнаццаць дзён, расцягнуўся на цэлы месяц, я пратэрмінаваў два дэдлайны. Але вынікам застаўся задаволены, і горад прыняў мурал на ўра! Гэта першы праект такога маштабу ў Віцебску, але не апошні. Гарадскія ўлады пачалі прыглядацца да муралаў і гатовы працягваць.

Глеб падзяліўся з намі, што на стварэнне сваіх работ яго натхняюць само жыццё, цікавыя людзі, кнігі, фільмы, тэатр, арт-паблікі, сны, прырода, гісторыі і міфы, падарожжы... Гэты спіс можна працягваць да бясконцасці.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзена героем.**